Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе па ініцыятыве У. П. Пархоменкі

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць 6 разоў у год

ГІСТОРЫЯ
ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

"У дапамогу педагогу" Серыя

№ 1 (37) - 2005

Заснавальнік і выдавец –
Установа «Выдавецтва
«Адукацыя і выхаванне»

РЭПОЗІТОРЫЙ ВГПУ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Галоўны рэдактар
М. І. Мініцкі

У. В. Тугай (першы намеснік галоўнага рэдактара)
Н. М. Ганушчанка (намеснік галоўнага рэдактара)
Л. В. Саламаха (адказны сакратар)
І. І. Багдановіч
С. В. Паноў
К. І. Сякацкая
С. М. Ходзін
В. М. Шутава

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

У. В. Тугай (старшыня)
М. М. Забаўскі
А. А. Каваленя
В. А. Капранава
Г. А. Космач
У. С. Кошалеў
М. С. Сташкевіч
В. М. Фамін
І. І. Цыркун

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 200-02-28 (адк. сакратар),
200-10-73 (аддзел маркетынгу),
факс: 200-54-10
e-mail: aiv@aiv.by
http:/www.aiv.by

Метадычныя парады па вывучэнні ў школах і сярэдніх навучальных установах факультатыва «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа» (у кантэксце Другой сусветнай вайны)

Працяг. Пачатак у № 4 за 2004 г.

Аляксандр Каваленя, *доктар гістарычных навук, прафесар, в. а. дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

Вялікія страты ў баях за вызваленне Беларусі панеслі і савецкія войскі. З 23 чэрвеня і да канца ліпеня 1944 г. чатыры франты страцілі 440 879 чалавек, у тым ліку забітымі 9[illegible]232 салдаты і афіцэры.

Беларуская наступальная аперацыя па сваім размаху, колькасці сіл, што ўдзельнічалі ў ёй, з'яўляецца адной з найбуйнейшых не толькі ў Вялікай Айчыннай, але і ва ўсёй Другой сусветнай вайне. З улікам рэзерваў, якія прыбывалі ў ходзе баёў, у ёй удзельнічала больш за 4 млн чалавек, каля 62 тыс. гармат, звыш 7100 самалётаў.

Летапіс барацьбы за вызваленне Беларусі багаты прыкладамі гераічных подзвігаў савецкіх воінаў. Звыш 1500 воінаў, што ўдзельнічалі ў Беларускай аперацыі, удастоены звання Героя Савецкага Саюза, больш за 402 тыс. узнагароджаны ардэнамі і медалямі, 663 злучэнні і часці атрымалі ганаровыя найменні Мінскіх, Віцебскіх, Бабруйскіх, Магілёўскіх і інш.

Як сімвал неўміручай славы савецкіх воінаў і партызанаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, узвышаецца ў Мінску на плошчы Перамогі велічны помнік-абеліск, перад якім гарыць Вечны агонь, на 21-м кіламетры маскоўскай шашы ўзняўся Курган Славы — даніна ўдзячнасці беларускага народа сваім вызваліцелям.

Узаемадзеянне партызанаў, падпольшчыкаў і насельніцтва з войскамі Чырвонай Арміі. Адной з вызначальных рыс Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» з'яўлялася тая надзвычай важная роля, якую адыгрывалі ў ёй партызанскія фарміраванні, што дзейнічалі ў тыле ворага на тэрыторыі рэспублікі. Партызанская барацьба ў Беларусі па сваіх маштабах, палітычных і ваенных выніках набыла ваенна-стратэгічнае значэнне і пераўтварылася ў адзін з важных фактараў разгрому варожай групы армій «Цэнтр» і вызвалення тэрыторыі рэспублікі. Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі і БШПР актыўна супрацоўнічалі з савецкім камандаваннем, узгаднялі сумесныя дзеянні партызанаў і войскаў Чырвонай Арміі. Значную работу па мабілізацыі партызанаў, падпольшчыкаў і жыхароў акупіраванай Беларусі на барацьбу супраць германскіх агрэсараў праводзілі абласныя і раённыя падпольныя партыйныя і камсамольскія камітэты і арганізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Из Постановления ЦК КП(б)Б «О разрушении ж.-д. коммуникаций противника методом рельсовой войны»

«...Железные дороги, проходящие через Белоруссию, на всем их протяжении находятся под непрерывным воздействием партизанских отрядов и диверсионных групп, что имеет громадное значение в срыве оперативных и стратегических замыслов противника. Вместе с этим ЦК КП(б) Белоруссии считает, что боевая работа белорусских партизан по разрушению путей подвоза противника может и должна быть усилена, к этому имеются все предпосылки и возможности. Важнейшими из этих условий имеются: повсеместное быстрое развитие самого партизанского движения, принимающего характер всенародного движения против оккупантов, наличие широкой сети связи, аэродромов и посадочных площадок для самолетов, управляемость всеми партизанскими отрядами и бригадами в оккупированных областях и районах Белоруссии, наличие работающих на месте областных и районных подпольных комитетов КП(б) Белоруссии.

Все эти благоприятные условия и громадная сила самого движения делают возможным в настоящий момент поставить перед партизанским движением в Белоруссии задачу — нанесения массированных ударов по ж.-д. коммуникациям противника в целях коренной дезорганизации всей ж.-д. сети, проходящей по территории Белоруссии.

Эта задача может быть успешно разрешена белорусскими партизанами не только организацией крушений воинских поездов, взрывов мостов ж.-д. станций, выводом из строя паровозов, вагонов, но и другими путями.

Внесенные по этому вопросу в ЦК КП(б) Белоруссии предложения, основанные на изучении двухлетнего опыта партизанской войны в тылу противника, показывают, что коренная дезорганизация ж.-д. коммуникаций врага может быть достигнута массовым разрушением рельсов ж.-д. путей.

Методом рельсовой войны разрушение коммуникаций можно довести до степени катастрофической для немецко-фашистских войск. При массовом применении этого способа борьбы противник принужден будет проводить огромные работы трудоемкого характера по замене взорванных рельсов для восстановления путей. Потребуется доставлять колоссальное количество стали, прокат, что для него будет почти неразрешимой задачей.

ЦК КП(б) Белоруссии постановляет:

1. Одобрить представленный на рассмотрение ЦК, разработанный по инициативе секретаря ЦК КП(б)Б тов. Пономаренко, план развертывания партизанской рельсовой войны в тылу немецких оккупантов как наиболее эффективный способ массового разрушения ж.-д. коммуникаций врага.

2. ЦК КП(б) Белоруссии призывает всех партизан и партизанок, командиров и комиссаров отрядов и бригад, руководителей диверсионных групп усилить непрерывные боевые действия по разрушению ж.-д. коммуникаций врага, использовать благоприятные возможности летнего периода для нанесения сильнейших массовых ударов по гитлеровской военной машине в наиболее уязвимых для нее местах.

Коренная дезорганизация ж.-д. коммуникаций врага составит историческую заслугу белорусских партизан в Великой Отечественной войне советского народа против немецко-фашистских захватчиков...»

Буйнейшай аперацыяй беларускіх партызанаў у перыяд падрыхтоўкі «Аперацыі Баграціён» было правядзенне трэцяга этапа «рэйкавай вайны», які быў распачаты за тры дні да наступлення савецкіх войскаў. Ноччу з 19 на 20 чэрвеня 1944 г. партызаны ажыццявілі масавыя атакі чыгуначных камунікацый ворага на ўсёй тэрыторыі акупіраванай Беларусі і падарвалі 40 775 рэек, паралізаваў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шы рух на гэтых камунікацыях. Ужо ў перыяд паспяховага наступлення Чырвонай Арміі партызаны да 29 чэрвеня дадаткова падарвалі яшчэ 20 тыс. рэек.

Адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, гітлераўцы не маглі скарыстаць чыгуначны транспарт у неабходным аб'ёме як для перавозкі рэзерваў, так і для эвакуацыі сваіх часцей і тылоў.

З пачаткам наступлення Чырвонай Арміі баявыя дзеянні партызанскіх атрадаў і брыгад набылі асобую сілу і размах па ўсёй тэрыторыі рэспублікі, асабліва на галоўных шляхах адступлення гітлераўскіх войскаў. Партызаны блакіравалі многія ўчасткі шашэйных і грунтовых дарог, нападалі на варожыя калоны, зрывалі перагрупоўку сіл ворага, парушалі кіраванне войскамі.

Вялізнае значэнне для паспяховага наступлення Чырвонай Арміі мелі дзеянні партызанаў па захопе і ўтрыманні да падыходу часцей савецкіх войскаў перапраў цераз водныя перашкоды і плацдармы на іх берагах. Імі былі захоплены дзеючыя пераправы і пабудаваны новыя праз рэкі Пціч, Случ, Друць, Ольса, Бярэзіна, Вілія, Шчара, Нёман, Котра. Гэтым партызаны дапамаглі часцям Чырвонай Арміі ў іх руху на захад.

Партызаны аказалі вялікую дапамогу савецкім войскам у вызваленні шмат якіх гарадоў і населеных пунктаў рэспублікі, у тым ліку Мінска, Барысава, Вілейкі, Докшыц, Дунілавіч, Ключава, Слуцка, Ліды, Лагойска, Лунінца, Любані, Маладзечна, Нясвіжа, Навагрудка, Смалявіч, Пінска, Стоўбцаў і інш.

Значную колькасць населеных пунктаў (Капыль, Уздзенічы, Карэлічы, Івянец і інш.) ва ўмовах хаатычнага адступлення гітлераўцаў партызаны вызвалілі сваімі сіламі і ўтрымалі іх да падыходу савецкіх войскаў.

Дзейсную дапамогу Чырвонай Арміі ў ліквідацыі акружаных варожых груповак аказалі партызаны. У ходзе сумесных баявых дзеянняў з часцямі Чырвонай Арміі, а таксама па ачыстцы тэрыторыі рэспублікі і ахове камунікацый савецкіх войскаў партызаны Беларусі знішчылі больш як 15 тыс. і ўзялі ў палон звыш 17 тыс. варожых салдатаў і афіцэраў.

Шмат у чым дапамагалі Чырвонай Арміі падпольшчыкі і насельніцтва. У гарадах і населеных пунктах падпольныя арганізацыі стваралі групы для назірання за прамысловымі прадпрыемствамі і памяшканнямі, якія падрыхтоўваліся гітлераўцамі да ўзрыву. Дом урада, будынак ЦК КП(б)Б, Акруговы Дом афіцэраў, многія дамы і прадпрыемствы ў Мінску ўдалося выратаваць толькі дзякуючы таму, што перадавыя часці, якія ўварваліся ў горад, хутка наладзілі кантакт з мясцовымі падпольшчыкамі і пры іх дапамозе неадкладна разміноравалі будынкі.

Жыхары вёсак па закліку партызанскага камандавання і падпольных арганізацый разбуралі варожыя камунікацыі — перакопвалі дарогі, знішчалі масты, рабілі лясныя завалы, перашкаджалі адступленню варожых войскаў. Калі савецкія воіны падыходзілі да населеных пунктаў і гарадоў, мясцовыя жыхары наладжвалі з імі сувязь, дапамагалі фарсіраваць водныя перашкоды, паказвалі варожыя засады, мінныя палі, замініраваныя будынкі і прадпрыемствы, праводзілі іх толькі ім вядомымі пуцявінамі, абыходзячы чаму нашы часці з'яўляліся там, дзе іх менш за ўсё чакаў вораг, гібелі варожых салдатаў і афіцэраў, што рассяліліся па палях, лясах і г. д.

Беларускі народ не толькі непасрэдным удзелам у барацьбе супраць акупантаў, але і самаадданай працай дапамагаў Чырвонай Арміі ў хутчэйшым разгроме ворага. Працоўныя вызваленых раёнаў наладжвалі работу прамысловых прадпрыемстваў, якія забяспечвалі патрэбы фронту, выходзілі на аднаўленне чыгунак, шашэйных і грунтовых дарог, на будаўніцтва мастоў. За кароткі тэрмін насельніцтва Беларусі аднавіла больш як 10 тыс. км чыгуначнага палатна і 1735 чыгуначных мастоў, пабудавала 2950 новых мастоў.

Працоўныя рэспублікі клапаціліся пра параненых воінаў, бралі шэфства над шпіталямі, аддавалі сваю кроў для выратавання параненых. З патрыятычным уздымам уступалі яны ў Чырвоную Армію, каб у яе радах працягваць барацьбу з фашысцкімі захопнікамі. Усяго з вызваленых раёнаў было прызвана 600 тыс. чалавек, у тым ліку 180 тыс. партызанаў.

Высокую свядомасць праявіла насельніцтва Беларусі, мабілізуючы харчовыя рэсурсы для савецкіх воінаў. У 1944 г. сяляне рэспублікі здалі звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі 3 млн пудоў хлеба, 25 млн пудоў бульбы [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паўсюдна ў дні вызвалення Беларусі ў гарадах і вёсках рэспублікі праходзілі шматлюдныя мітынгі, на якіх працоўныя выказвалі гарачую ўдзячнасць Чырвонай Арміі за збаўленне ад фашысцкага рабства, за вяртанне да жыцця.

Урачыста і па-святочнаму прайшоў 16 ліпеня 1944 г. мітынг працоўных і партызанаў Мінска і Мінскай вобласці сумесна з прадстаўнікамі Чырвонай Арміі, на які сабралася 50 тыс. працоўных сталіцы і больш за 30 тыс. партызанаў, прыбыў камандуючы 3-м Беларускім фронтам генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі і дэлегацыя працоўных з горада Горкага (Ніжняга Ноўгарада), якая прывезла эшалон падарункаў. Пасля мітынгу адбыўся грандыёзны партызанскі парад, які з'явіўся дастойным завяршэннем гераічнай народнай барацьбы партызанаў і ўсіх жыхароў рэспублікі супраць гітлераўскіх захопнікаў.

Беларускі народ пры актыўнай дапамозе ўсіх народаў Савецкага Саюза ўключыўся ў аднаўленне мірнага жыцця. Намаганні працоўных былі накіраваны галоўным чынам на тое, каб хутчэй увесці ў строй прадпрыемствы прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі, якія забяспечвалі неабходнай прадукцыяй фронт і пацярпеўшае насельніцтва. «Усё для фронту, усё для перамогі!» — гэты лозунг стаў важнейшым для працоўных Беларусі, вызваленых ад германскага прыгнёту. На працягу некалькіх месяцаў пасля выгнання фашысцкіх акупантаў былі адноўлены амаль усе калгасы і саўгасы рэспублікі.

У напаўразбураных майстэрнях на ўскраіне Мінска ў кароткі тэрмін было створана прадпрыемства па зборцы аўтамабіляў. Да канца гады Чырвоная Армія атрымала ад мінан 8 тыс. грузавікоў.

Раней устаноўленага тэрміну, у канцы 1944 г., пачаў выпуск прадукцыі для фронту калектыў авіяпрадпрыемства. Да сакавіка 1945 г. ён сабраў 240 і адрамантаваў 237 баявых самалётаў.

У сціслыя тэрміны былі адноўлены Мінскі вагонарамонтны завод, Віцебскія станкабудаўнічыя заводы імя Кірава і імя Камінтэрна, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», «Гомсельмаш», Гомельскі паравозарамонтны завод і іншыя прамысловыя аб'екты рэспублікі. У 1944 г. далі прадукцыю 179 тэкстыльных, 263 швейных і 487 гарбарных прадпрыемстваў. Да канца года дзейнічалі 15 заводаў рэспубліканскага падпарадкавання і 188 раённых прамысловых прадпрыемстваў.

Адной з неадкладных задач было аднаўленне транспарту, асабліва чыгуначнага, ад якога залежала забеспячэнне фронту. Першы поезд у вызвалены Мінск прыбыў 10 ліпеня, на сёмы дзень пасля вызвалення, у Маладзечна — 11 ліпеня, у Ліду — 19 ліпеня і г. д. У самы заходні горад рэспублікі — Брэст — паязды прыбылі на трэці дзень пасля яго вызвалення.

З вялікімі цяжкасцямі адбывалася адраджэнне разбуранай ворагам гаспадаркі. Аднаму беларускаму народу было б не пад сілу ў кароткія тэрміны аднавіць разбураную гаспадарку. На дапамогу прыйшла уся краіна. На працягу 1944 г. у Беларусь прыбыло 487 вагонаў розных грузаў з Сібіры, Урала, Горкаўскай і Яраслаўскай абласцей, 137 вагонаў з будаўнічымі матэрыяламі, сталлю з Удмурцкай АССР. Толькі з сакавіка 1944 г. па студзень 1945 г. з розных раёнаў краіны ў Беларусь паступіла звыш 10 тыс. грузаў на суму 8200 тыс. рублёў.

Вялікая дапамога, якую атрымала Беларусь ад рэспублік былога СССР, дазволіла не толькі ў кароткі тэрмін аднавіць прамысловасць і сельскую гаспадарку рэспублікі, але і зрабіць значны крок у далейшым індустрыяльным развіцці нашай дзяржавы.

Велеть кому-нибудь дать тебе готовые мысли — это поручить другой женщине родить твое дитя. Есть мысли, которые надо самому рожать в муках, и они-то самые ценные.

Я. Корчак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ